ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 200 (1459) | СУБОТА 29 жніўня 1931 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менгаркому ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . 3 р. 60 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ XI.
Кошт асобнага №—2 кап.

Не дапусьціць зацяжкі асеньняй пасеўнай

Колгасы „Чырвонае Сьвітаньне" і „Селянін" асеньнюю сяўбу сустракаюць не гатовымі

БРАЦЬ ПРЫКЛАД З КОЛГАСУ „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ"

Да разгортваньня масавай асеньняй сяўбы па БССР засталіся лічаныя дні. Рад раённых комсамольскіх організацый, колгасаў і сельсаветаў не падрыхтавалася, аднак, да сустрэчы яе ва ўсеўзброеньні, што пагражае зацяжкай сяўбы.

Раённыя комсамольскія організацыі павінны зараз-жа, не чакаючы ні хвіліны, разгарнуць шырокую масавую работу вакол разгортваньня асеньняй сяўбы; мобілізаваўшы ўсю масу колгасьнікаў, упарта змагацца за своечасовы пачатак сяўбы і недапушчэньне яе зацяжкі.

Ліквідацыю абязьлічкі адклалі да вясны

Колгасы „Чырвонае сьвітаньне" і „Селянін", Волацкага с-с. Хойніцкага р-ну, у асноўным да асеньняй сяўбы падрыхтаваны.

Ужо складзены рабочыя пляны, падрыхтаваны сельска-гаспадарчыя машыны і іншы інвэнтар.

Уся рабочая сіла колгасу разьбіта па брыгадах. Зараз колгасы праводзяць зябляваньне іржышча пад жыта; колгас „Чырвонае сьвітаньне" заараў ужо 50 га.

Волацкі сельсавет мала дапамагае колгасу ў організацыі працы. 15 жніўня на пленуме сельсавету быў заслухан даклад старшыні колгасу „Чырвонае сьвітаньне" аб працы колгасу, дзе сельсавет даваў няправільныя ўстаноўкі ў пытаньнях організацыі працы.

Колгасьнікі ўнасілі прапановы, каб ліквідаваць безадкладна абязьлічку інвэнтара і цягавай сілы, шляхам прымацаваньня іх да брыгад і пасобных колгасьнікаў, але гэтая каштоўная прапанова сельсаветам ня прынята і адкладзена да вясны (!).

Патрэбна ўшчэнт разьбіць шкодныя думкі наконт адкладваньня ліквідацыі абязьлічкі да вясны і зараз-жа правесьці прымацаваньне інвэнтара і цягавай сілы.

Васілёк А.

Любаньскі раён сустракае асеньнюю сяўбу не падрыхтаваным

Падрыхтоўка да асеньняй сяўбы ні колгасным, ні аднаасобным сэктарам Любаньскага р-ну не разгорнута.

Колгасьнікі і аднаасобнікі разважаюць, што да асеньняй сяўбы шмат часу і рыхтавацца яшчэ рана ?!).

Ня прыступлена да складаньня пасенных фондаў, што пагражае зрывам пляну сяўбы да 1-га верасьня.

Асноўная прычына слабога ходу падрыхтоўкі да асеньняй сяўбы—слабейшая бяздзейнасьць партыйных і комсамольскіх ячэек, а таксама і сельсаветаў.

Неабходна зараз-жа запоўніць прабелы і нагнаць упушчанае ў разгортваньні асеньняй сяўбы.

Бурда У.

УВАГА СЕВУ АЗІМЫХ

Значная часта раёнаў Беларусі прыступіла ўжо да асеньняй сяўбы.

Пасьпяховая сяўба азімых у гэтым годзе мае выключнае значэньне. Азімымі пасевамі па Беларусі згодна пляну неабходна пакрыць плошчу ў 1.350 тысяч га (у тым ліку пад жыта 1298073 га, і пшаніцу—50.800 га), прычым толькі колгасны сэктар павінен засеяць 698985 га азімымі.

Аднак, якасьць праведзенай падрыхтоўкі да севу ні ў якай ступені не адпавядае запатрабаваньням, не забясьпечвае пасьпяховае выкананьне пляну севу. У радзе месц плян севу азімых не даведзены да колгасаў, колгасьнікаў, вёсак, аднаасобнікаў, нават ня прыведзены ў належны парадак інвэнтар, слаба ўдзельнічае ў гэтай важнейшай рабоце комсамольская організацыя.

Неабходна зараз-жа дабіцца рашучага пералому. Плян севу азімых павінен быць ня толькі даведзены да саўгасаў, колгасаў, брыгад, колгасьнікаў, вёсак, але ў самы мінімальны тэрмін выкананы. Опортуністычныя разважаньні аб тым, што нібы асеньнюю сяўбу можна расьцягнуць і не сьпяшаючыся праводзіць да першага сьнегу, павінны атрымаць рашучы адпор. Трэба памятаць, што позьнія засевы асабліва надатны вымярзаньню і адмоўцы.

Кантрольны пленум ЦК ЛКСМБ яскрава указаў, што „асноўнай задачай організацыі ў час сяўбовай кампаніі павінна быць барацьба за скарачэньне тэрміну севу, за 100 проц. выкананьне пляну севу ў колгасах, саўгасах і аднаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарках з поўным правядзеньнем аграмінімуму".

Гэтая задача павінна быць зьдзейсьнена. Ленінскі комсамол у адказе за пасьпяховае правядзеньне севу азімых. Зьдзейсьненьне яе—у правільнай растаноўцы сіл, людзей і машын, у правільнай організацыі працы, у ліквідацыі абязьлічкі,ураўнілаўкі, у пераходзе на зьдзельшчыну, у разгортваньні ўдарніцтва і соцспаборніцтва.

Разам з гэтым, неабходна з асаблівай сілай змагацца за якасьць севу. Сартавы і радковы сеў, добрае, пратручанае насеньне павінны быць пастаўлены ў цэнтр увагі комсамольскай організацыі і ўсёй пролетарскай грамадзкасьці.

Работу па севу азімых неабходна ўвязаць са скончэньнем уборачнай кампаніі, з нарыхтоўкамі ўсіх відаў, з ворывам пад зяб, прасякнуўшы яе барацьбою за далейшы рост колгаснага руху, за організацыйна-гаспадарчае ўмацненьне колгасаў. 1.670 тысяч га павінна быць узорана пад зяб. Гэта адказная задача. Яна павінна быць выканана не пазьней як да 10 кастрычніка. Зяблівае ворыва—адзін з [illegible] хуткага ўзьняцьця ўраджайнасьці нашых палёў, павышэньня таварнасьці сельскай гаспадаркі. Ня менш 75 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак да часу вясеньняга севу 1932 году павінны быць колектывізаваны.

На выкананьне усіх гэтых задач комсамольская організацыя, пад кіраўніцтвам партыі, павінна мобілізаваць увагу ўсіх колгасьнікаў, колгаснай моладзі, батракоў, серадняцкаў, аднаасобнікаў.

Кожная комсамольская ячэйка, брыгада, а таксама кожны саўгас, колгас, па ініцыятыве комсамольцаў, у прывітаньне да 17 МЮД, абавязаны выраўнаць фронт сяўбы азімых.

Баявой самаправерцы--баявы размах

ГОМЕЛЬ ВЫКЛІКАЕ МЕНСК НА ЛЕПШАЕ ПРАВЯДЗЕНЬНЕ САМАПРАВЕРКІ ВАЙСКОВАЙ РАБОТЫ

Забясьпечыць баявы ход і размах

Месяц таму назад маскоўскі комсамол узьняў пытаньне аб організацыі самаправеркі вайсковай работы комсамолу па ўсім саюзе.

Гэтая ініцыятыва была падтрымана спэцыяльнай пастановай ЦК УсеЛКСМ, якая прапанавала ўсім організацыям уключыцца ў праверку.

Рад організацый, як Чэрвеньская, Чырвона-слабодзкая, практычна ўключыліся ў самаправерку, разгортваюць баявую работу па падрыхтоўцы да праверкі і выкарыстоўваюць максімум часу для набыцьця магчыма большых ведаў. Сёньня мы друкуем баявы плян разгортваньня самаправеркі па гомельскай організацыі. Гомель выклікае на соц. спаборніцтва менскую організацыю. Пачын Гомеля павінны падхапіць астатнія організацыі Беларусі.

Мы абавязаны быць гатовы ў любую хвіліну на абарону нашай краіны. Неабходна зараз-жа выкарыстаць рэшту часу да МЮД'у для падрыхтоўкі і правядзеньня самаправеркі. Самаправерка вайсковых ведаў павінна ўзьняць тэмпы і якасьць вайсковай работы.

Г.

Аб самаправерцы ня ведаюць

Вайсковая работа па Лёзьненскім раёне зусім не разгорнута.

Комсамольцы маюць вялікую ахвоту да вайсковай вучобы. Аднак, як ячэйкі, так і райком КСМ, недаацэньваюць яе. Зараз усе організацыі КСМ, у парадку падрыхтоўкі да МЮД'у, разгортваюць самаправерку вайсковай работы. Але, у Лёзьне аб гэтым ня ведаюць. Месячнік самаправеркі павінен сарваць маскі з ігноруючых вайсковую работу.

К.-у

Плян правядзеньня праверкі вайсковых ведаў па Гомельскай організацыі

Надаючы вялікае значэньне ініцыятыве маскоўскага комсамолу аб правядзеньні самаправеркі вайсковых ведаў, якая адначасна зьявіцца штурхачом для далейшага палепшаньня вайсковай работы і аўладаньня вайсковай тэхнікай, гомельская організацыя выклікае на соцспаборніцтва менскую організацыю ЛКСМБ у лепшым правядзеньні самаправеркі вайсковых ведаў.

Мы бярэм на сябе наступныя абавязкі:

1. Праверку вайсковых ведаў скончыць да 17 МЮД'у;

2. У падрыхтоўчы пэрыод да праверкі шырока разгарнуць масавую растлумачальную працу сярод комсамольцаў і асоавіяхэмаўцаў на прадпрыемствах, давёўшы да кожнай ячэйкі КСМ і Асоавіяхэму і кожнага комсамольца пляны праверкі, пабудаваныя на конкрэтных мэтах і задачах актыўнага ўдзелу комсамолу і асоавіяхэмаўцаў у абароннай рабоце, на падставе рашэньняў IX-га Усесаюзнага зьезду УсеЛКСМ і X-га зьезду ЛКСМБ;

3. Самаправерку скарыстаць, як падрыхтоўку да разгортваньня масавай зімовай вайсковай вучобы, з канчатковым організацыйным афармленьнем, пераходам і замацаваньнем сыстэмы самастойных асоавіяхэмаўскіх навучальных пунктаў, поўнай дыфэрэнцыяцыяй складу рабочай моладзі, якая прыцягваецца да вайсковай вучобы, організацыяй адзінага пляну вайсковай абароннай работы на кожным прадпрыемстве;

4. Праверку ператварыць у шырокі грамадзкі агляд удзелу комсамолу ў абароннай рабоце, праводзячы яе мэтодамі соц. спаборніцтва і ўдарніцтва, індывідуальнага і групавога пабудаванага на конкрэтных мэтах, задачах і паказчыках, на аснове шырокай крытыкі і самакрытыкі прарываў і недахопаў,

5. Ход праверкі увязаць і падпарадкаваць задачам выкананьня політгаспадарчых задач выкананьню промфінпляна, уборкі—ліквідацыі абязьлічкі і цякучасьці рабочай сілы на вытворчасьці і г. д.

6. Ход праверкі і ўдзелу комсамольскай і асоавіяхэмаўскай організацыі ў абароннай рабоце на прадпрыемствах шырока асьвятляць ў газ. „Чырвоная зьмена", мясцовай газэце, насьценгазэтах і шматтыражках на прадпрыемствах, ствараючы асобныя рабкораўскія сыгнальныя пасты і прыцягваючы асоавіяхэмкораў.

7. Дабіцца замацаваньня цеснай ідэйнай сувязі з падшэфнымі вайсковымі часткамі і колгасамі, атрымліваючы практычную дапамогу і садзейнічаньне з боку першых і дапамагаючы апошнім (колгасам) у наладжваньні абароннай работы.

8. Вылучыць для кіруючай работы ў сэктары Гарсавету ААХ з комсамольскага актыву ня менш 50 асоб і папоўніць бюро асоавіяхэмаўскіх колектываў, цэхавых ячэек і рэўкамісій на кожным прадпрыемстве комсамольцамі.

9. У пэрыод праверкі правесьці наступную работу:

а), уцягнуць у рады Асоавіяхэму ўсіх комсамольцаў і беспартыйную рабочую моладзь;

б) ахапіць рознымі відамі спэцыяльнай вайсковай вучобы ўсіх комсамольцаў;

в) на кожным прадпрыемстве ў цэхах організаваць комсамольскія асоавіяхэмаўскія ўдарныя брыгады;

г) да 17 МЮД'у ўсім комсамольцам фізкультурнікам здаць іспыты на атрыманьне значка „Гатоў да працы і абароны";

д) да першага верасьня ліквідаваць запазычанасьць па сяброўскім узносам і скончыць збор сродкаў на зьвяно самалётаў імя „Комсамолу Беларусі";

е) прыняць актыўны ўдзел у адборы прызыўнікоў 1909 году, ліквідаваць няпісьменнасьць іх. Адначасова пачаць работу па ліквідацыі няпісьменнасьці сярод прызыўнікоў 1910 году нараджэньня;

ж) уцягнуць усіх піонэраў у рады „юных прыхільнікаў абароны";

з) сярод комсамольцаў і сябраў асоавіяхэму правесьці масавую работу па павялічэньню падпіскі на газэты і часопісы: „На варце", „Чырвоная зьмена", „Чырвонаармейская праўда", „Авіяцыя і хэмія".

10. Тэрмін выкананьня гэтага дагавору: да 10-га верасьня 1931 году.

11. Па скончэньню тэрміну дагавору менская і гомельская організацыі ЛКСМБ абменьваюцца справаздачамі і дакладамі аб праробленай працы.

Арбітрамі прасіць „Чырвоную Зьмену" і „Палескую праўду".

Гомельскі Гарком ЛКСМБ і Гарсавет ААХ

Азімы клін яшчэ не адведзены

У Рудзенскім с-с, Пухавіцкага р-ну, не адведзены яшчэ азімы клін, таксама няма пляну работ на час асеньняй пасеўнай.

Колгасы „Бязбожнік", „Чырвоная зьмена" і індывідуальнікі в. Рудзенск ня ведаюць яшчэ, дзе і на якім вучастку яны будуць сеяць.

Рыг. М.

Сяўба азімых пачалася

Колгас „Інтэрнацыянал", Горбаўскага сельсавету, Лёзьненскага р-ну, датэрмінова скончыў уборку азімых і тэхнічных культур і прыступіў да засеву азімых. На 20-е жніўня колгас засеяў 25 га.

У колгасе поўнасьцю падрыхтаваны свабодны пар плошчай у 120 га. На апошнім сходзе колгасьнікі заявілі, што пераходны сьцяг імя Лёзьненскага РК КП(б)Б у час асеньняй сяўбы заваюць.

Комсамольская ячэйка колгасу таксама своечасова абгаварыла пытаньне аб правядзеньні асеньняй сяўбы і мобілізавала ўсю колгасную моладзь і дарослых колгасьнікаў.

М. Гузоўскі

Ільнасаўгасам Бігосава, Барковічы і 10-годзьдзя БССР

Тэлеграма

Організуйце на мясцох сустрэчу і максімальнае скарыстаньне на рашаючых вучастках уборкі лёну і канапель мобілізаваных ЦК ЛКСМБ комсамольцаў у ліку 300.

Вышліце прадстаўнікоў у дапамогу мобілізацыі не пазьней 29-га—Віцебск, Полацк, Бабруйск.

Нам. упаўнаважанага ільнатрэсту Бабіцкі.

Комсамолія, рыхтуйся!

3-га верасьня, а 9-й гадзіне ўвечары, адбудзецца пашыранае паседжаньне радые-мюдаўскай камісіі сумесна з комсамольскім актывам па пытаньню папярэдніх вынікаў падрыхтоўкі да МЮД'у.

Парадак паседжаньня:

1. Уступнае слова мюдаўскай камісіі (5 хвілін).

2. Выступленьні пасобных раёнаў: Менскі ГБ (20 хвіл.) рапарт аб росьце комсамолу і аб перадачы ў партыю; Друкарня імя Сталіна—аб падрыхтоўцы да новага навучальнага году; з-д Варашылава—аб выкананьні прамфінпляну і рапарт „Чырвоназьменаўскай" комуны па гасразрахунку. Віцебск (10 хвіл.)—рапарт ГК аб організацыі маладзёжных цэхаў, гаспадарча-разьліковых брыгад і замацаваньні росту, колектыў „Сьцяг індустрыялізацыі"—аб маладзёжнай істужцы. Магілёў (10 хвіл.)—рапарт колектыву шоўкавай фабрыкі аб удзеле організацыі ў выкананьні прамфінпляну. Барысаў (10 хвіл.)—рост комсамолу і мобілізацыя мас на торп. Койданава (10 хвіл.)—організацыя працы ў колгасах (ударніцтва, зьдзельшчына, улік; ячэйка МТС—аб выкананьні трактарпляну. Слуцак (8 хвіл.)—ператварэньне ў жыцьцё пастановы ЦК УсеКП(б) аб жывёлагадоўлі і сілосаваньні, Бабруйскі РК (15 хвіл.)—рост і колектывізацыя; колектыў комбінату—аб выкананьні пляну лесаэкспорту і капітальнага будаўніцтва ФЗВ. Тураў (8 хвіл.)—політмінімум і ваенізацыя. Гомель (15 хвіл.)—рапарт ГК аб падрыхтоўцы к МЮД'у, росьце комсамолу, выкананьні прамфінпляну, Колектыў Гомсельмашу—выкананьне пляну выпрацоўкі сельска-гаспадарчых машын і організацыя гаспадарча-разьліковых брыгад. Асінторф (10 хвіл.)—шэфства над электрофікацыяй і выкананьне пляну торпаздабычы. Дрыса (12 хвіл.)—рапарт РК аб ходзе ўборкі лёну і ячэйкі ільназаводу—аб ходзе будаўніцтва.

З пуцёўкай, уручанай Леніным

ПАКАЛЕНЬНЕ РЭВОЛЮЦЫІ НА ПОДСТУПАХ К 17 МЮД'у

Рэволюцыйнымі прыкладамі барацьбы комсамолу СССР цэмантаваць рады братэрскіх сэкцый КІМ'у

З дакладу сэкратара ВК КІМ тав. Чамаданава на сходзе пропагандыстых і агітатараў маскоўскай організацыі УсеЛКСМ

Сама гісторыя ўзьнікненьня і праводзеньня мюдаўскіх дзён ня мае сьценкі, якая аддзяляе яе ад гісторыі нашага юнацкага руху.

МЮД зьявіўся перш за ўсё яркім выразам організаванай падтрымкі з боку рэволюцыйных элемэнтаў моладзі тае лініі, за якую змагаліся бальшавікі пад кіраўніцтвам Уладзіміра Ільліча Леніна, будучы ў радох II Інтэрнацыяналу і зьяўляючыся яго левым, сапраўды рэволюцыйным крылом.

Хіба выпадкова тое, што на Штутгардзкай конфэрэнцыі, азначаўшай спробу аб'яднаньня юнацкіх соцыялістычных організацый, у парадак дня было ўключана пытаньне аб барацьбе з мілітарызмам, дакладчыкам па якому выступаў К. Лібкнэхт. Гэта конфэрэнцыя супала з кангрэсам II Інтэрнацыяналу, які таксама адбываўся ў Штутгарце.

Рашэньні Штутгардзкага кангрэсу па сутнасьці вызначылі ня толькі адносіны II Інтэрнацыяналу, адносіны соцыялістых да імпэрыялістычнай, колёніяльнай політыкі і да вайны,—а і ўсю іх прынцыповую лінію. Пры абгаварэньні колёніяльнага пытаньня ярка выявілася наяўнасьць опортунізму ў II Інтэрнацыянале. У дыскусіі ж па пытаньню аб барацьбе з надыходзячымі імпэрыялістычнымі войнамі вы крыліся тэндэнцыі соцыял-шовінізму.

Штутгардзкая конфэрэнцыя была склікана наперакор волі рэформістых. Яе рашэньні насілі недастаткова політычна выразны, а ў паасобных пунктах памылковы характар, і ўсё-ж рэформісцкае партыйнае кіраўніцтва II Інтэрнацыяналу не запаволіла прыняць цэлы рад мер для „абясшкоджваньня" рашэньняў. прынятых у Штутгарце, і такіх мер, якія-б зябясьпечылі ўмацаваньне яго ўплыву на моладзь. Яно ішло па лініі ўтварэньня ўмоў перашкаджаючых інтэрнацыянальнаму аб'яднаньню юнацкіх організацый і іх разьвіцьцю.

Але ці ўдалося рэформістым загасіць тое пламя інтэрнацыянальнай юнацкай барацьбы супроць імпэрыялізму і мілітарызму, якое было запалена К. Лібкнэхтам ў Штутгарце? Не. Урэзаўшы правы Інтэрнацыяналу моладзі, дабіўшыся ліквідацыі самастойнасьці шмат якіх юнацкіх соцыялістычных організацый. яны атрымалі ў радзе краін ад соцыялістычных організацый моладзі адпаведны адпор. Яны атрымаўшы адпор ў Швэцыі, Італіі і іншых краінах, не змаглі сваімі „мерапрыемствамі" прыпыніць рост рэволюцыйнай актыўнасьці і опозыцыі моладзі.

Шлях рэформістых — шлях банкруцтваў

Імпэрыялістычная вайна зьявіўшыся продуктам разьвіцьця капіталізму сарваўшы маску з пацыфістых, гэтых паборнікаў „вечнага міру" на зямлі, якія разглядаюць „мір" па-за сувязі і ізолявана ад клясавай барацьбы, адначасна жорстка выкрыла і соцыял-шовіністычную існасьць рэформізму.

І у той час, калі рэволюцыйнае крыло соцыял-дэмократыі пад кіраўніцтвам Леніна ішло па шляху Цымэрвальдзкай конфэрэнцыі, па шляху стварэньня Комуністычнага Інтэрнацыяналу,—рэформісты пайшлі па лініі банкруцтва, якое азначала перамогу опортунізму ў радох соцыял-дэмократыі. Само сабою зразумела, што барацьба ў радох соцыял-дэмократыі адлюстроўвалася і ў юнацкім руху. Тыя „тэорыі". якія мелі месца ў радох соцыялдэмократыі аб абароне „айчызны", аб тым, што Інтэрнацыянал—гэта перад усім „інструмант міру", які ня можа дзейнічаць у час вайны,—былі рэформістымі ўжыты на практыцы, Дэнэнбэрг, сэкратар Міжнароднага юнацкага бюро, „з прычыны немагчымасьці падтрыманьня інтэрнацыянальнай сувязі у час вайны, з прычыны цяжкасьцяй зносін" зрабіў вельмі проста—ён зачыніў гэта юнацкае міжнароднае бюро. У час вайны на дзьверах гэтага юнацкага бюро зьявілася славутая шыльда:

„З прычыны абвешчаньня вайны бюро зачынена".

Праз некалькі месяцаў пасьля пачатку вайны паміж паасобнымі соцыялістычнымі організацыямі моладзі (швэдзкай, італьянскай, швэйцарскай) пачалася перапіска, у якой высоўвалася пытаньне аб скліканьні конфэрэнцыі. І вось, кіруючыся згодай гэтых організацый, а таксама організацый такіх краін, як Голяндыя, Данія, Францыя, Вілі Мюнцэнбэрг, які ў той час быў сэкратаром юнацкай організацыі ў Швэйцарыі, унёс прапанову ў Міжнароднае юнацкае бюро аб скліканьні ў Швэйцарыі міжнароднай конфэрэнцыі. На гэтую прапанову Данэнбэрг даў адказ адмоўны. І вось, ня глядзячы на саботаж, ня гледзячы на адмаўленьне ад удзелу ў работах конфэрэнцыі з боку цэлага раду організацый у тым ліку Нямецкай соцыялістычнай організацыі моладзі, старшынёю якое быў Фрыц Эбэрт,—4-га красавіка 1915 году ў Бэрне адбылася II Міжнародная юнацкая конфэрэнцыя. Гэта конфэрэнцыя мела вялізарнае політычнае значэньне ў разьвіцьці юнацкага руху.

На Бэрнскай конфэрэнцыі па існасьці быў утвораны новы Соцыялістычны Інтэрнацыянал моладзі, сэкратаром якога быў абраны Вілі Мюнцэнбэрг. Бэрнская конфэрэнцыя паставіла ў цэнтр увагі барацьбу з мілітарызмам, барацьбу з соцыял-патрыотамі. Але трэба таксама адзначыць, і тое, што на гэтай конфэрэнцыі выявіліся і цянявыя бакі юнацкага руху. Бальшавікі, якія прысутнічалі на конфэрэнцыі і прымалі актыўны ўдзел у яе рабоце, не атрымалі большасьці галасоў па пытаньнях аб мэтодах і задачах барацьбы юнацкай соцыялістычнай організацыі з мілітарызмам.

На Бэрнскай конфэрэнцыі было прынята рашэньне аб сьвяткаваньні МЮД.

Ленін і Лібкнэхт—організатары комуністычнага юнацкага руху

Пасьля Бэрнскай конфэрэнцыі ў радох юнацкага руху пачынаецца больш моцны процэс расьпластаваньня.

Перанясеньне цэнтру юнацкага руху ў Швэйцарыю, дзе ў гэты час знаходзілася ў эміграцыі значная група бальшавікоў на чале з Ул. І. Леніным, устанаўленьне з ім больш цеснай сувязі, пачатак выданьня часопісу „Інтэрмол", у якім Ленін і прадстаўнікі рэволюцыйнага крыла соцыял-дэмократыі прымалі актыўны ўдзел, разгорнутая пасьля конфэрэнцыі юнацкіх організацый ажыўленая політычная дыскусія,—усё гэта не магло ня спрыяць аформленьню юнацкага руху. Паступова, крок за крокам, юнацкія соцыялістычныя організацыі адыходзілі з пад уплыву рэформістых і пераходзілі на бок левага крыла, якое вяло барацьбу пад кіраўніцтвам Уладзімера Ільліча.

Першы МЮД, які быў праведзен 3-га кастрычніка 1915 году, галоўным чынам у нэйтральных краінах, дэмонстрацыі протэсту, якія мелі месца ўвесну 1916 году супроць арышту Карла Лібкнэхта, другі і трэці МЮД у часе вайны, організацыйнае і політычнае аформленьне Соцыялістычнага Інтэрнацыяналу моладзі,—усё гэта зьяўлялася паказчыкам росту актыўнасьці працоўнае моладзі ў барацьбе з капіталізмам.

4-га сакавіка 1919 году пасьледвала афіцыйнае ўтварэньне Комуністычнага Інтэрнацыяналу, якое знаймавала сабою канчатковы разрыў рэволюцыйнай соцыял-дэмократыі з II Інтэрнацыяналам, які пагруз у опортуністычным балоце.

У маі 1918 году партыя бальшавікоў, парываючы сувязь з меншавікамі перайменоўваецца ў Расійскую комуністычную партыю. Праз некалькі месяцаў пасьля гэтага, нямецкі рэволюцыйны саюз „Спартак", організаваны К. Лібкнэхтам, перайменоўваецца ў комуністычную партыю Нямеччыны.

Рэволюцыйная лінія, якая праводзілася пасьля Бэрнскай конфэрэнцыі Міжнародным юнацкім бюро, у барацьбе з партыямі, якія пагрузьлі ў опортуністычным балоце, і з тымі юнацкімі організацыямі, якія знаходзіліся пад уплывам рэформістых, забясьпечыла рост рэволюцыйнага руху моладзі. І ў 1917 годзе ў Інтэрнацыянале моладзі налічвалася вялікая колькасьць членаў (220,000) і многа сэкцый.

Утварэньне КІМ'у

І вось, на гэтым этапе разьвіцьця руху выступае УсеЛКСМ, як рэволюцыйны атрад, аб'яднаўшы юнацкія соцыялістычныя організацыі пад сьцягам Комуністычнага Інтэрнацыяналу.

Да лютаўскай рэволюцыі, як вядома, у Расіі самастойнага юнацкага руху амаль не існавала.

Пасьля лютаўскай рэволюцыі разьвіцьцё юнацкага руху ў Расіі набывае шырокі размах і масавы характар.

Рэволюцыйны юнацкі рух у Расіі, які зарадзіўся ў агні грамадзянскай вайны, хутка афармляўся пад кіраўніцтвам бальшавіцкае партыі, актыўна ўдзельнічаючы ў клясавай барацьбе. у Комуністычны саюз моладзі.

РКСМ устанавіў з першых-жа дзён свайго існаваньня правільныя ўзаемаадносіны з бальшавіцкай партыяй, уключыўся ў міжнародны юнацкі рух і паставіў пытаньне аб утварэньні КІМ.

На адбыўшымся IV Міжнародным кангрэсе соцыялістычнай моладзі, зьявіўшымся па існасьці першым кангрэсам Комуністычнага Інтэрнацыяналу моладзі, выразна выявілася кіруючая роля дэлегацыі РКСМ, ухваленая Выканкомам Комінтэрну і Ул. І. Леніным.

Па пытаньню аб уступленьні ў Комінтэрн ня было разгалосьсяў, але па пытаньню азначэньня існасьці ўзаемаадносін паміж КІМ і Комінтэрнам,

паміж партыямі і саюзамі ўзьніклі буйныя розьгалосьсі.

Рад таварышоў, у ліку якіх былі Мюнцэнбэрг і Шыллер, сталі на тым пункце погляду, што КІМ у адносінах да Комінтэрну павінен быць сваяцкай організацыя , якая прызнае яго програму, падтрымлівае з ім цесны контакт, але захоўвае „вядомую політычную свабоду руху , ня зьвязваючы сябе аднак безагаворачна далучэньнем па ўсіх тактычных пытаньнях.

Пасьля вялікай дыскусіі кангрэсам была прынята большая частка прапановы дэлегацыі РКСМ аб уваходзе Інтэрнацыяналу моладзі ў III Інтэрнацыянал. Па пытаньню-ж аб узаемаадносінах паміж партыямі і саюзамі кангрэс прыняў няправільнае, авангардысцкае рашэньне. У гэтым рашэньні падкрэсьлівалася, што „рабочая моладзь—самая актыўная і самая рэволюцыйная частка пролетарыяту" і што ўзаемаадносіны паміж партыяй і комсамолам вызначаюцца самастойнасьцю моладзі, цесным контактам і ўзаемным падтрыманьнем.

Памылка кангрэсу ў тым, што ён прынцыпы ўзаемаадносін з партыямі пэрыяду імпэрыялістычнай вайны, пэрыяду барацьбы з рэформізмам, механічна перанёс у новыя ўмовы, не ўсьвядоміўшы да канца таго, што ўтварэньне комуністычнага Інтэрнацыяналу адзначала новы этап ў разьвіцьці рэволюцыйнага руху і высоўвала перад юнрухам новыя і ня менш важныя. чым у мінулым, задачы.

Некаторыя сэкцыі КІМ яшчэ і сёньня разглядаюць сябе, як другую комуністычную партыю, копіруючы партыю ў формах і мэтодах работы Пацьверджаньнем гэтага можа таксама зьявіцца той факт. што ў нас на сёньня яшчэ шмат вядзецца гутарак аб так званай юнацкай політыцы.

Погляд аб „сваяцтве" організацыі, аб „самастойнасьці дзеяньняў" працягваў яшчэ доўгі час жыць ў кіраўніцтве КІМ, спараджаючы на практыцы памылкі.

Пад знакам бальшавізацыі сэкцый КІМ'у

Сёньня ў Комуністычным Інтэрнацыянале моладзі, які зьяўляецца, як ідэйна, так і організацыйна зьяднаным, на аснове барацьбы за лінію Комінтэрну, актуальным пытаньнем зьяўляецца пытаньне бальшавізацыі яго сэкцый.

Пад знакам бальшавізацыі праходзілі у мінулым юнацкія міжнародныя дні. І пад гэтым-жа знакам, змагаючыся за рэалізацыю рашэньняў XI-га пленуму Комінтэрну і прэзыдыуму ВККІМ, мы будзем праводзіць 17-ты МЮД.

Асноўнай асаблівасьцю тых, умоў у якіх мы будзем праводзіць 17 МЮД зьяўляецца нарастаньне прадпасылак рэволюцыйнага крызісу ў такіх краінах, як Нямеччына, Польшча, Кітай, Гішпанія—нарастаньне таго крызісу, які не аддзелены кітайскай сьцяною ад непасрэднай рэволюцыйнай сітуацыі і які непарыўна зьвязаны з ростам рэволюцыйнага ўздыму ва ўсім сьвеце.

Што-ж робіцца ў сучасны момант ў радох СІМ, які быў створан у процівагу КІМ? Яго кіраўніцтва ўсяляк стараецца апраўдаць аказанае яму давер'е і імкнецца, заглушыўшы рост рэволюцыйнай опозыцыі ў сваіх радох, папярэдзіць пераход сваіх членаў у рады КІМ.

Сёньня КІМ—ленінскі комсамол—у барацьбе за шматмільённы ахоп рабочай і сялянскай працоўнай моладзі дасягнуў вялізарных посьпехаў і налічвае ў зваіх радох каля 5 мільёнаў членаў. Ленінскі комсамол сваім актыўным ўдзелам у соцыялістычным будаўніцтве дабіўся павышэньня ўдзельнае вагі ва ўсім політычным і гаспадарчым жыцьці краіны Саветаў. Кітайскі комсамол паказваючы ўзоры рэволюцыйнага гэроізму і адданасьці ў барацьбе за лёзунгі аграрнай і антымілітарыстычнай рэволюцыі, за ўмацаваньне і абарону савецкіх раёнаў, стаў на шлях ператварэньня ў сапраўды масавую організацыю, яднаючы як організацыйна, так і політычна ў сваіх радох і у радох створанай ім падсобнай юнацкай організацыі— „Маладая гвардыя"—сотні тысяч.

Комсамол Нямеччыны, які змагаецца пад кіраўніцтвам партыі за заваёву большасьці рабочае клясы, адваёўвае моладзь пад разлагаючага ўплыву СІМ выступае як баявы організатар працоўнае моладзі, амаль шчыльна прыблізіўся да ажыцьцяўленьня пастаўленай ім задачы—ператварэньня ў стотысячную організацыю.

Комсамол Польшчы, ня гледзячы на надзвычайна цяжкія ўмовы, дабіўся ў сваім разьвіцьці значных посьпехаў і можа быць пастаўлены у прыклад вельмі многім сэкцыям КІМ, якія працуюць у легальных умовах.

Росту КІМ спрыялі: цьвёрдасьць і выразнасьць бальшавіцкага партыйнага кіраўніцтва, барацьба пад кіраўніцтвам Комінтэрну як з конкрэтнымі носьбітамі галоўнай небясьпекі—правымі опортуністымі, так і з троцкістымі ўнутры руху, уздым рэволюцыйнай актыўнасьці моладзі і павышэньню ролі сэкцый КІМ у экономічных баёх моладзі. Ці можам мы прызнаць гэты рост дастатковым? Бязумоўна не Рост сэкцый КІМ ва ўсіх капіталістычных краінах намі ня можа быць прызнаны здавальняючым, бо наш організацыйны ахоп не адпавядае нашаму-ж політычнаму ўплыву на моладзь.

Ня спыняючы, а ўзмацняючы барацьбу на два фронты, ідучы ў гушчу рабочай і працоўнай моладзі, упарта працуючы над умацаваньнем і ўтварэньнем новых апорных пунктаў на фабрыках і заводах, выкрываючы правадыроў рэформісцкіх профсаюзаў, організуючы стачкі, якія прымаюць зараз асабліва вялікае значэньне, утвараючы адзіны раволюцыйны фронт— нашы сэкцыі павінны дабіцца таго каб у бліжэйшы-ж часдолець перамагчы аставаньне і перастаць быць сэктанцкімі, накшталт ангельскага саюзу, організацыямі. Умовы для перасіленьня адставаньня і ператварэньня ў масавыя організацыі бязумоўна ў наяўнасьці. Партыйная дапамога і кіраўніцтва забясьпечаны. Гісторыя працуе на нас.

Усю ўвагу усе сілы на выкананьне казаньняў тав. Сталіна

17 МЮД у Савецкім Саюзе праводзіцца пад асноўным вядучым лёзунгам: „Дагнаць і перагнаць у бліжэйшае дзесяцігодзьдзе перадавыя ў тэхніка-экономічных адносінах капіталістычныя краіны".

Што-ж зьяўляецца зараз асноўным у нашай дзейнасьці, за што мы павінны ўхапіцца з тым, каб, нашчупаўшы галоўнае, пасьпяхова вырашыць усе сур'ёзьнейшыя і адказьнейшыя задачы, якія стаяць перад намі?

Гэтыя новыя задачы ня так даўно былі ўказаны тав. Сталіным у яго прамове на нарадзе гаспадарнікаў. Іменна сюды, на выкананьне гэтых задач, павінна быць зьвернута ўся наша ўвага, мобілізаваны нашы сілы.

Ленінскі комсамол вырас за апошнія гады на некалькі мільёнаў новых членаў.

У гэтых умовах асабліваe значэньне набывае пытаньне выхаваньня тых новых мільёнаў, якія ўліваюцца ў нашы рады.

Мы маем у ленінскім комсамоле, які налічвае каля 5 мільёнаў чалавек, больш палову членаў, уступіўшых у яго рады ў 1930 годзе і пазьней.

Выхоўваючы падрастаючае пакаленьне ў духу інтэрнацыяналізму, дапамагаючы братэрскім замежным сэкцыям КІМ, змагаючыся разам з імі за хутчэйшую іх перабудову, мы павінны дабіцца яшчэ большых посьпехаў на фронце соцыялістычнага будаўніцтва і ў разьвіцьці міжнароднага юнацкага рэволюцыйнага руху.

ПА ТОЙ БОК МЯЖЫ

Італьянскі фашызм пераймае практыку польскага

ПАРЫЖ. „Юманітэ" публікуе ліст італьянскага політзьняволенага з турмы ў Корэджыо, дзе апісаны жудасны рэжым, якому падпарадкуюць політычных зьняволеных ў фашысцкіх турмах. Турма у Корэджыо, піша зьняволены, зьяўляецца адной з самых згублівых для здароўя ў Італіі. Там пануе тропічная гарачыня, заразныя хваробы лютуюць з прычыны ігнараваньня элемэнтарных патрабаваньняў гігіены і адсутнасьці мэдыцынскай дапамогі. Так, напрыклад труп памершага на працягу 48 гадзін заставаўся ў камеры. дзе сядзелі таварышы небожчыка, Спатканьні з сваякамі забаронены. Перадачы прысвайваюцца турэмнай адміністрацыяй. Політзьняволеных зьбіваюць і кідаюць ў карцэр за адмаўленьне вітаць турэмнае начальства па ўзору фашыстых.

Наступ на зарплату рабочых

БЭРЛІН, 27. Па даных нямецкага кон'юнктурнага інстытуту, скарочаньне зарплаты за першую палову бягучага году складае ня малага 30 мільярдаў марак. Аднак, даныя інстытуту ня цалкам ахопліваюць скарочаньне зарплаты рабочых і служачых. Па вылічэньнях вядомага экономістага-статыстыка Кузьмінскага згуба ў зарплаце складае за першае паўгодзьдзе 1931 г. 4,1 мільярда марак.

Далейшае скарочаньне зарплаты комунальнікам

БЭРЛІН. 26. Сумесная конфэрэнцыя прадстаўнікоў бэрлінскага гарадзкога кіраўніцтва і бургомістраў гарадзкіх раёнаў Бэрліну пастанавіла скараціць зарплату комунальным работнікам на 20 проц. і паменшыць выдаткі на дапамогу і пэнсію тым, хто знаходзіцца пад апекаю. Гарадзкое кіраўніцтва спадзяецца, што ў выніку гэтых мерапрыемстваў у бюджэце бягучага году будзе атрымана экономія ў суме 20-30 мільёнаў марак.

Альбо галодная сьмерць, альбо соцыяльны пераварот

ШАНХАЙ, 25. Прыбыўшы з Ханькоу начальнік фінансавага бюро Хубэйскага ўраду паведаміў наступнае аб становішчы ў провінцыі Хубэй: „Найбольш населеныя і багатыя акругі знаходзяцца пад вадой Ня менш 10 мільёнаў чал. у провінцыі аказаліся зусім без прытулку, без адзежы, без ежы. Каля 10.000 ужо памёрла з голаду. Такой агромністай паводкі Кітай ня ведае ўжо каля 500 год. У выніку паводкі можна чакаць вялікіх соцыяльных узрушэньняў ва ўсім Кітаі. У Хубэі, у Хунані, у Цьзянсі, Анхуэй маецца ня менш 25 мільёнаў чал., для якіх ёсьць толькі 2 выйсьця; альбо галодная сьмерць, альбо соцыяльны пераварот".

Расстрэл комуністых у Цьзінані

ШАНХАЙ, 27. Кітайскія газэты паведамляюць, што 19 жніўня ў Цьзінані, па пастанове павятовага суда, расстраляны 21 комуністы, якія памерлі з выкрыкамі: „Няхай жыве комуністычная партыя!"

ЛКСМБ адказвае за плян 1931

Агні генэральнага клічуць

У бойках за якасьць, за тэмпы, за плян--складаць чарцяжы генэральнага

Менская комсамолія, комсамол ВЭО на працягу трох месяцаў не пайшлі далей сваёй дэклярацыі

Оргкамітэт пры Дзяржпляне павінен забясьпечыць опэрацыйнае кіраўніцтва

Тры месяцы—тэрмін зусім выстарчальны, каб разгарнуць работу па ажыцьцяўленьню узятых на сябе абавязкаў і выкананьню вызначаных плянаў.

Тры месяцы—тэрмін, які мінуў пасьля зьмяшчэньня „Ч. З." першай старонкі, прысьвечанай організацыі сустрэчы генэральнага.

Тры месяцы—час, на працягу якога адбыўся ўсебеларускі рабселькораўскі зьезд, заслухаўшы пытаньне аб складаньні генпляну, а таксама уключылася ў гэтую працу менская комсамолія, комсамолія ВЭО, „Полымя рэволюцыі" і завод Варашылава.

У працу па організацыі матар'ялу для паасобных галін наступнай пяцігодкі уключыліся і беларускія цэнтральныя газэты.

Мінула тры месяцы.

За гэты час амаль ніводзін з комсамольскіх колектываў, акрамя комсамоліі „Полымя рэволюцыі", не аддаў гэтай рабоце належнай увагі, не ўвязаў яе задачай выкананьня пляну трэцяга рашаючага, аўладаньня тэхнікай, лепшай растаноўкі сіл і рэалізацыі гістарычных указаньняў тав. Сталіна.

Мінула тры месяцы. Гэта быў час, калі многія організацыі абмежаваліся голай мітынгоўшчынай, голымі гутаркамі без конкрэтных спраў.

Сёньнешняя старонка—старонка контрольная. Трымаючы раўнаньне па комсамоліі „Полымя рэволюцыі",—на бліжэйшы час дабіцца карэннага пералому.

Да гэтага клічуць агні генэральнага.

„Полымя рэволюцыі"

Першую пяцігодку электрыфікацыі Савецкага Саюзу—рабочая кляса выканала з гонарам. Зараз мы будзем ня толькі ўдарнікамі другой пяцігодкі, але і яе плянавікамі. Пачатак складаньня пляну электрыфікацыі будзе пакладзены непасрэдна ў варштатах. Гэта значыць, што плян вялікіх работ другой пяцігодкі будзе складзены мільённым атрадам плянавікоў ад варштатаў.

Наш комсамольскі колектыў падхапіў ініцыятыву „Чырвонкі" аб удзеле ў складаньні генэральнага пляну электрыфікацыі Беларусі. Пад непасрэдным штодзённым кіраўніцтвам „Чырвонай зьмены", мы здолелі ўжо практычна прыступіць да працы. Мы маем:

1. Раней электраэнэргія выкарыстоўвалася без усялякага вучоту, зараз мы дабіліся ўстанаўленьня кантрольных лічыльнікаў, ні хвіліны дарэмнай працы матораў, за экономію электроэнэргіі.

2. Нагрэў заклёпак у нас на заводзе праводзіўся яшчэ зусім прымітыўна—саматужным спосабам на адну заклёпку трацяліся цэлыя хвіліны, а зараз мы прыступілі да ўстаноўкі электрагорна, гэта дасьць тысячы рублёў экономіі. Камандзір электра-горна—комсамолец.

3. Мы супроць ручной пагрузкі і разгрузкі. „Даеш электрыку",—пад гэтым лёзунгам мы вынайшлі спосаб электраабсталяваньня пляцформы для пагрузачных і разгрузачных прац. Уся пагрузка і разгрузка будзе электрыфікавана. Камандзір яе—комсамолец.

4. Супроць недагрузкі матораў, супроць дарэмнага руху трансмісій, за поўную нагрузку. З гэтай мэтай праводзіцца вучот нагрузкі матораў. На ненагружаныя моторы ўключаюцца новыя трансмісіі (дрэваапрацоўчы цэх).

5. Узяўшы на сябе абавязак дапамагчы скласьці плян электрыфікацыі для трох саўгасаў мы зрабілі адзін выхад у падшэфны саўгас, дзе пачалі праводзіць складаньне пляну.

6. Мы ўзялі шэфства над электразваркай заводу, да мінімуму ўлічыць усю магчымую працу электразваркі, дабіваючыся поўнага пераводу асноўных відаў працы па рамонту вагонаў на электразварку.

Зараз комсамольцы-электразваршчыкі пачалі вырэзку рамонтных заплат на электразварцы. Склад электразваркі—2 комсамольцы і 1 сябра партыі. Устанаўліваецца адна новая машына. Яе камандзірам рыхтуюцца комсамольцы.

Ёсьць у гэтай працы і недахопы. Асноўныя з іх гэта тое, што яшчэ ня ўся комсамолія ўключылася ў гэту працу.

ЦБ ЛКСМБ, „ЧЗ" і оргкамітэт па складаньню генпляну, што гэту працу наш колектыў скончыць ганарова як перадавы і першым здасьць генэральны плян электрыфікацыі заводу „Полымя рэволюцыі".

Плянава-опэрацыйныя групы заводу.

МГК ЛКСМБ

Шмат часу прашло з таго дня, як Менскі гарком ЛКСМБ узяў шэфства над пабудовай Менскай цёпла-электра-цэнтралі і вынес пастанову аб тым, што комсамолія Менску павінна прыняць удзел у складаньні генэральнага пляну электрыфікацыі.

На вялікі жаль, акрамя добрых пачынаньняў з прыгожымі пастановамі паасобных колектываў, нічога яшчэ ня зроблена.

У рабоце па складаньню генпляну і ажыцьцяўленьню шэфства над менскай ЦЭЦ комсамольская організацыя мае вялікі прарыў.

Гэты прарыў да 17 МЮД'у неабходна ліквідаваць. Сэкцыям, паасобным галінам прамысловасьці, якія організаваны гаркомам для складаньня генпляну, неабходна ажывіць сваю працу.

Адказныя кіраўнікі за працу сэкцый, т. т.: Янкевіч—транспортная, Лапідус—маталёвая, Норкін—гарбарная, Марошак—швейная, Хобат—харчовая, Вігдорчык—будаўнічая, Зэмбель—сельска-гаспадарчая, павінны адказваць за бязьдзейнасьць у рабоце. Работу сэкцый па складаньню генпляну электрыфікацыі на прадпрыемствах, установах трэба ўвязаць з працай па складаньню пэрспэктыўнай пяцігодкі.

Колектывы КСМ павінны зараз-жа ўзяцца за гэтую працу, падцягнуць наркоматы і ведамствы, якія да гэтага часу адстаюць.

Па гэтаму пытаньню Менгарком КСМ склікае на днях нараду масава-вытворчых працаўнікоў колектываў і ячэек, дзе будзе дадзена конкрэтнае заданьне кожнай ячэйцы, кожнаму колектыву. Узброеныя заданьнем нарады комсамольскія організацыі павінны пайсьці на штурм і дапамогу ведамствам і наркоматам у складаньні пяцігодкі.

Пабудова Менскай ЦЭЦ к тэрміну павінна стаць жывою справай комсамоліі менскай організацыі.

М. Т-кі.



Вольтмэтры на першаку беларускай энэргетыкі—Белдрэсе

Оргкамітэт

Праца па складаньню генэральнага пляну электрыфікацыі БССР ўжо значна рушыла ўперад. Да працы прыцягнуты спэцыялістыя з Масквы і Ленінграда, таксама дзейны ўдзел у працы оргкамітэту прымае Маскоўскі тарпяны інстытут.

Зараз ужо ў асноўным складзены наметкі генэральнага пляну электрыфікацыі Савецкай Беларусі. Далейшая праца тармозіцца, адпак, безадказнымі адносінамі некаторых організацый, якія самі павінны непасрэдна ўдзельнічаць у складаньні генпляну, але ня выконваюць у тэрмін заданьняў оргкамітэту.

Дагэтуль не прадставілі матар'ялаў: горная група Дзяржпляну, прамгрупа, сельска-гаспадарчая група і значная частка аб'яднаньняў ВСНГБ.

Ужо пачынаюць паступаць, праўда надзвычайна слаба матар'ялы райвыканкомаў.

Неабходна адзначыць, што оргкамітэт недастаткова опэрацыйна кіруе працай тых організацый, якія ўдзельнічаюць у складаньні генэральнага пляну. У камітэце нават няма сталых зьвестак аб тым якія організацыі ўжо выканалі ў тэрмін заданьне, а якія зрываюць прадстаўленьне матар'ялаў.

Затрымка матар'ялаў—значны тормаз у далейшай працы па складаньню генпляну і пляну другой пяцігодкі. Затрымліваючы адну, стадыю працы, яны гэтым самым затрымліваюць і ўсе астатнія.

Оргкамітэт павінен садзейнічаць Менскаму комсамолу ў ажыцьцяўленьні каштоўнага мерапрыемства пры складаньні пляну—раскопцы архіваў, што дасьць значныя матар'ялы, зараз пахаваныя ў шафах

ВЭО

На заклік „Чырвонай Зьмены" і ліст плянавікоў заводу „Полымя рэволюцыі", комсамольская організацыя ВЭО ўключылася ў разгортваньне працы па падрыхтоўцы матар'ялаў для складаньня генэральнага пляну электрыфікацыі.

Аб'яднанае паседжаньне комсамольскай ячэйкі, рабочых і інжынэрна-тэхнічнага пэрсоналу прыняло шмат конкрэтных, надзвычайна каштоўных прапаноў. З часткай гэтых прапаноў, у адказе на выклік комсамольская ячэйка выступіла на старонках „Чырвонай Зьмены".

На вялікі жаль, яны не знайшлі конкрэтнага праламленьня ў штодзённай працы комсамольскай організацыі. Ніводзін з пунктаў ня выкананы. Да гэтага часу не сабраны матар'ялы па электрабудаўніцтву, ня прыняты захады да своечасовага складаньня генпляну.

Шуміхай і парадчасцю займалася комсамольская ячэйка ВЭО, замест практычнага ўдзелу ў складаньні пляну электрыфікацыі.

Комсамольскі колектыў Дзяржпляну, таксама бязьдзейнічаў у гэтай рабоце ня выконваючы даручаныя парт'ячэйкаю Дзяржпляну абавязкі на праверцы ходу складаньня пляну. Дзяржплянаўскі колектыў не дапамог комсамольскай ячэйкі ВЭО правесьці ў жыцьцё вынайдзеныя імі мерапрыемствы.

Даволі абавязацельстваў і абяцанак, трэба прыступіць да прац . Комсамольскія ячэйкі ВЭО і Дзяржпляну павінны паказаць і пакажуць добрыя прыклады шэфства над электрыфікацыяй.

Д. Пінхасік

* * *

Шпаркі тэмп электрыфікацыі беларускай прамысловасьці паглынуў усе кваліфікаваныя кадры рабочых электрычнай прамысловасьці, якія былі да гэтага часу. Зараз ужо адчуваецца вялікі недахоп у рабочых-электраманцёрах.

Пэрспэктывы наступнага гаспадарчага пляну і выкананьне колёсальных задач генпляну прад'яўляць яшчэ больш вялікія і адказныя запатрабаваньні.

Організацыя падрыхтоўкі кадраў і комплектаваньня школы ФЗВ пры ВЭО ў надзвычайна пагражаючым стане. У ФЗВ электраманцёраў да гэтага часу не падана і 25 проц. агульнай колькасьці неабходных заяў.

Быць манцёрам на рыштаваньнях генэральнага—ганаровая справа для кожнага маладога рабочага. ЛКСМБ і ў першую чаргу Менская комсамолія павінна забясьпечыць комплектаваньне ФЗВ электра-манцёраў у бліжэйшыя дні лепшымі сваімі прадстаўнікамі.

Агляд друку

АБАВЯЗАК ЗАСТАЕЦЦА ДЭКЛЯРАЦЫЯЙ

Складаньне генэральнага пляну электрыфікацыі і другой пяцігодкі пастаўлена як практычная задача сёньнешняга дня ня толькі перад плянавымі органамі, гаспадарчымі організацыямі, але і перад усімі працоўнымі. „Ударнікі першай пяцігодкі—плянавікі другой"—вось лёзунг працоўных у складаньні другой пяцігодкі.

Друк павінен мобілізоўваць і быць практычным організатарам удзелу мас у гэтай працы. Выходзячы з гэтых задач друку, „Чырвоная Зьмена" абавязалася і практычна прыступіла да працы з масамі юнкораў, працоўнай моладзі і плянава-опэрацыйнымі групамі па складаньню матар'ялаў генэральнага пляну электрыфікацыі. „Ч. З."

На Днепрабудзе заканчваецца монтаж другой турбіны.

выклікала ўвесь цэнтральны друк (газэты „Рабочий", „Савецкая Беларусь", і „Колгасьнік Беларусі") на разгортваньне працы па пэўных, конкрэтных галінах.

„Зусім мае рацыю комсамольская газэта заяўляючы, што ў справе практычнай падрыхтоўкі пляну баявых работ на далейшыя гады друк павінен адыграць важнейшую ролю",—піша „Рабочий" у сваім адказе на наш выклік (ад 1-га чэрвеня г. г.).

Газэта „Рабочий" у адказ на наш выклік паведамляе: „мы прымаем гэты выклік. Рэдакцыя газэты „Рабочий", пры самым шырокім удзеле рабкораў-ударнікаў, пачне масавую работу вакол падрыхтоўкі матар'ялаў для плянаў разьвіцьця будаўніцтва, гарбарна-абутковай прамысловасьці і коопэрацыі (падкрэсьлена намі, рэд.)—гэтых важнейшых галін соцыялістычнай гаспадаркі".

Але газэта „Рабочий" на працягу трох месяцаў з часу надрукаваньня выкліку і адказу (чэрвень, ліпень, жнівень) не правяла ніводнага масавага мерапрыемства, не зьмясьціла ніводнага матар'ялу, які-б мобілізоўваў усю масу рабкораў і працоўных на ўдзел у складаньні другой пяцігодкі.

На працягу трох месяцаў абавязак застаўся дэклярацыяй.

* * *

Выклік „Чырвонай Зьмены", быў прыняты і газэтай „Савецкая Беларусь". Яна ўзяла "... на сябе абавязак організаваць шырокія масы рабочых, колгасьнікаў, беднякоў і серадрякоў, культармейцаў, ударнікаў культфронту, рабселькораў для падрыхтоўкі матар'ялаў па складаньню пляну культурнай пяцігодкі БССР".

Узятыя абавязкі засталіся дэклярацыяй. За тры месяцы (чэрвень, ліпень, жнівень) была зьмешчана толькі адна перадавая (ліпень, „С. Б." № 168) „За адзіны плян культурнага будаўніцтва, у якой „Савецкая Беларусь" констатавала, што: „Трэба ўзьняць масу на практычны ўдзел у справе падрыхтоўкі матар'ялаў для складаньня другой пяцігодкі", і пастанова ЦСПСБ аб складаньні пляну другой пяцігодкі.

„Савецкая Беларусь" не ўвязала пытаньні барацьбы" за своечасовы пачатак навучальнага году, за будаўніцтва новых школ, інтэрнатаў і г. д. з падрыхтоўкай матар'ялу для складаньня другой пяцігодкі.



Электразварка руйнуе старыя мэтоды працы.

1-га ВЕРАСЬНЯ БССР ПАВІННА СЕСЬЦІ ЗА ПАРТУ

Ударна падрыхтуемся да сустрэчы „Дня вучобы"

1-га верасьня—„Дзень вучобы". Да „Дня вучобы" засталося толькі 3 дні. Аднак, комсамольскія організацыі зусім нездавальняюча рыхтуюцца да гэтага дня. У шмат якіх раёнах БССР будаўніцтва школ ідзе вельмі маруднымі тэмпамі. Комсамольскія організацыі гэтых раёнаў, як шэфы, не паклапаціліся дабіцца пералому, не змаглі забясьпечыць своечасовае скончаньне школ да 1-га верасьня, каб падрыхтаванымі сустрэць навучальны год.

3 дні, што засталося да пачатку навучальнага, трэба максімальна скарыстаць для скончаньня набудовы школ, для ўдарнай падрыхтоўкі да „Дня вучобы".

Усім комсамольскім організацыям трэба зараз-жа шырока пераняць вопыт Вандаражцаў, якія па-бальшавіцку ўзяліся за падрыхтоўку да „Дня вучобы", наладжваюць карнавал „за вучобу", вучнёўскую конфэрэнцыю, масавыя сходы колгасьнікаў і г. д.

Тры дні да пачатку навучальнага трэба зрабіць днямі напружанай ударнай работы па падрыхтоўцы школ да занятказ, па падрыхтоўцы грамадзкасьці да „Дня вучобы".

Вучэцеся ў вендаражцаў

Рыхтавацца да „Дня вучобы"

Гэтымі днямі адбылася нарада настаўнікаў Вендараскага сельсавету, на якой абгаворана пытаньне аб правядзеньні „Дня вучобы". Мяркуецца правесьці карнавал „за вучобу" і, вучнёўскую конфэрэнцыю, на якой абгаварыць пытаньні навучальнага году.

На ўсіх колгасах сельсавету праведзены масавыя колгасныя сходы. Заслуханы даклады настаўніцтва аб выніках прароблёнай школамі за 1930-31 год працы і задачах, якія стаяць перад надыходзячым навучальным годам. Першага верасьня будзе організаваны ўрачысты масавы паход вучняў у школы.

Задачы новага навучальнага году абгаворана на пленуме сельсавету, прыняты рад конкрэтных мерапрыемстваў і абавязкаў.

Зараз рамонтуюцца школы, але Вендараснае сельпо, ня гледзячы на папярэднія заяўкі школ, да гэтага часу не нарыхтавала шкла. Гэты недахоп павінен быць зараз-жа па-баявому ліквідаваны.

„К" С. Парфіяновіч.

ЗВОДКА

Аб стане падручнікаў і політпадручнікаў на 25 жніўня 1931 году

У якім стане	Заказы БДВ		Зак. Цэнтрвыд.		Усяго
	падручн.	п-падручн.	падручн.	п-падручн.	
Не набіраюцца . . .	15	—	2	—	17
Набраны і затрыманы Галоўлітам і аўтар. у карэктурах	2	—	—	—	2
Набраны і набіраюцца	9	5	8	3	25
Гатовы да друку і друкуюцца	8	1	3	—	12
Ня друк. з-за адсутн. паперы	11	—	—	—	11
Перапялатаюцца . .	5	—	4	1	10
Усяго.	50	6	17	4	77

Забясьпечце своечасовы пачатак навучальнага

Падрыхтоўка да новага навучальнага году ў Рагачоўскім р-не пад пагрозай зрыву. 14 школ, вызначаных па пляну да пабудовы, к пачатку навучальнага году ня будуць скончаны. Гатовы будуць толькі 2-3 школы.

Будаўніцтва большасьці школ не распачата з-за бязьдзейнасьці сельсавету і загадчыкаў школ. Школы не забясьпечаны настаўнікамі. Раёну не хапае 78 настаўнікаў, галоўным чынам для 1-га концэнтру, і ніхто, аб гэтым не клапоціцца.

Ян. Клімковіч.

Ліквідаваць прарывы на хаду

Праз тры дні пачынаецца новы навучальны год, але Анатоўская, Караваеўская і Каробавіцкая школы (Пухавіцкі раён), якія патрабавалі вялікага рамонту, зусім не рамантаваліся і не падрыхтаваны да навучаньня. Рудзенскі сельсавет не адпусьціў сродкаў, каб своечасова распачаць рамонт.

Дзеці 8-15 гадовага ўзросту ахоплены ўсеагульным навучаньнем толькі на 96 проц. Ніякай падрыхтоўкі да „Дня вучобы" не праводзіцца.

Прарыў Рудзенскага сельсавету ў падрыхтоўцы да навучальнага году трэба зараз-жа на хаду ліквідаваць.

Рыг. М.

У паходзе за клясава-сьвядомае і пісьменнае папаўненьне РСЧА

Час не чакае

Шырэй барацьбу за паўнацэнны прызыў!

7-га верасьня—першы дзень прызыву ў рады Рабоча-Сялянскай Чырвонай арміі. Менскі галаўны атрад, які ў апошні час па-баявому рушыў у паход, усё яшчэ не рэалізаваў задач падрыхтоўкі да прызыву.

Кіраўніцтва Менскага галаўнога атраду павінна шмат увагі аддаць абмену вопытам паміж асобнымі колектывамі і ячэйкамі ЛКСМБ. Трэба, шырока разгортваючы соцспаборніцтва і ўдарніцтва, максымальна падвышаць тэмпы паходу за клясава-сьвядомы і пісьменны прызыў. У гэтым—парука баявога выкананьня задач, стаячых перад прызывам трэцяга, рашаючага.

Выкарыстаць вопыт перадавых

Змагацца за пераходны сьцяг ГК

7 Верасьня першы дзень прызыву ў Менску. Ня гледзячы на тое, што засталося 9 дзён, рад колектываў ЛКСМБ не забясьпечылі беспрабойнасьці ў працы адборачных прызыўных камісій.

Некаторыя колектывы па-сапраўднаму змагаюцца за клясава-сьвядомае папаўненьне і маюць ня дрэнныя вынікі. Рад-жа колектываў і асабліва асобныя сакратары і вайсковыя працаўнікі (вэлбуд, „Дрэваапрацоўшчык", „Полымя Рэвалюцыі") зрываюць прызыў.

Прыклад работы па клясаваму адбору, ліквідацыі няпісьменнасьці, уцягненьня прызыўнікоў у комсамол і па перадачы іх у партыю—паказаў колектыў Менбуду. Тут з 50 чалавек дапризыўнікоў, 44 комсамольцы. Праведзены вучот дапризыўнікоў па цэхаўцах. У кожнай цэхячэйцы складзена кам'ся па клясаваму адбору. На сходах пасьля дакладу аб значэньні прызыву гэтага году абгаварвалі кандыдатуру кожнага прызыўніка.

Узор у працы паказаў колектыў ЛКСМБ заводу „Ударнік". Тут спачатку работы прызыўнікоў вучот прызыўнікоў. Выяўлены няпісьменныя, шляхам індывідуальнага прымацаваньня і гуртка ліквідавалі няпісьменнасьць. Наладжваецца экскурсія ў падшэфную частку. Усе прызыўнікі замацаваны на працы да апошняга дня адпраўкі ў часьць.

На абутковай фабрыцы камісія па адбору ужо закончыла сваю работу. Сьпісы перададзены вайсковаму работніку ў гарком ЛКСМБ. Характарыстыкі патрэбна даваць на шырокіх сходах працоўных, не замыкаць у вузкія рамкі камісій. У гэтай галіне правільна наступіла, складзеная камісія пры колектыве ЛКСМБ фабрыкі „Кастрычнік". Камісія сваю думку выносіць на абгаварэньне шырокіх сходаў рабочых.

У Белжылсаюзе у выніку праведзенай работы ўсе прызыўнікі падпісаліся на пазыку „Трэці рашаючы" на месячны зарабак.

Для лепшага прыцягненьня працоўных да справы прызыва на вялікіх прадпрыемствах Менску (завод „Варашылава", Комунар, абутковая фабрыка) адборачныя камісіі будуць працаваць на месцах. Да працы адборачных камісій колектывы павінны падрыхтавацца. Да пачатку працы адборачных камісій патрэбна скласьці сталыя падрабязныя характарыстыкі на кожнага прызыўніка. Забясьпечыць актыўны ўдзел комсамолі і ўсіх рабочых прадпрыемстваў у рабоце камісіі. Трэба, каб ударнікі „варштатаў" былі ударнікамі „вінтоўкі".

Лепшай настаноўкай працы, абмеркаваньнем характарыстык на агульных шырокіх сходах рабочых, своечасовай дастаўкай характарыстык у адборачныя камісіі, поўнай ліквідацыяй няпісьменнасьці прызыўнікоў, шырокім разгортваньнем соцспаборніцтва—ячэйкі Менску павінны змагацца за пераходзячы чырвоны сьцяг Менгаркому ЛКСМБ.

Кавалевіч.

ШТО ВАМІ ЗРОБЛЕНА?

Да ўсіх настаўнікаў, скончыўшых мсьціслаўскія двухгадовыя пэдкурсы ў 1928 годзе

Паважаныя таварышы! Скончыўшы разам з вамі пэдкурсы, я зараз працую на фронце асьветы ў Чырвонай арміі. Кожны дзень я наглядаю, як цяжка аўладаць вайсковай справай таму байцу, які прышоў у Чырвоную армію няпісьменным. Замест таго, каб вывучаць стральбу, кулямёт і іншую вайсковую тэхніку, прыходзіцца шмат часу траціць на набыцьцё навыкаў чытаньня, пісьма і г. д. З Чырвонай арміі кожны баец выходзіць пісьменным.

Але той час, які ідзе на ліквідацыю няпісьменнасьці, было-б значна карысьней патраціць на набыцьцё вайсковых ведаў, якія цяпер у сувязі з узмацненьнем вайсковай тэхнікі неабходны кожнаму байцу ў большай ступені, чым раней. Вы павінны даць у Чырвоную армію пісьменнае папаўненьне. Ніводнага прызыўніка 1909 году няпісьменнага! Прыкладзіце ўсе сілы на выкананьне гэтай задачы.

Выклікаю ўсіх таварышоў, а пэрсанальна: Азарэнку Я., Панамарава Я, Заранкіна, Ключанкова М., Букініча П., Кавецкага М., Фрузарава, Сімчанку, Зылькова, Пылянкова, З. Горбач, Пакроўскую, Анішчэнка А, Маслакову Т., Ратабыльскую, Мікалаеву, Шуман, Гарбавіцкую, Цітову, Фэдчанка, Дзямідзенку, Стэльмах М., Абуховіч, Сікорскага П., Загурскую, Казлоўскую, Кузьмянкова П, Цыганкова, Валюжаніч Ш. і астатніх адказаць праз „Чырвоную Зьмену"—што вы робіце ў гэтым напрамку і што вамі зроблена?

Старшы настаўнік сапбату
Міхась Варачаеў.

Будзем ударнікамі Чырвонай

Мы, прызыўнікі шчотачнай фабрыкі ім. Крупскай (Менск) бярэм на сябе наступныя абавязкі:

1. Працаваць на фабрыцы да апошняга дня адыходу ў Чырвоную армію.

2. Аб'яўляем сябе ўдарнікамі Чырвонай арміі і выклікаем на соцспаборніцтва прызыўнікаў заводу „Комунар".

Подпісы прызыўнікоў.

Папраўка

Ва ўчарайшым нумары „Ч.З." па недагляду карэктуры друкарні, у загалоўку артыкулу „Шляхі разьвіцьця соцыялістычнай жывёлагадоўлі" надрукавана: „Плян вялікіх работ на 1991-32 г." Трэба чытаць: „на 1931-32 г.".

Цяпер-жа рыхтавацца да двухмесячніка агляду і правядзеньня беларусізацыі

Множыць вопыт варашылаўцаў

X усебеларускі зьезд ЛКСМБ запісаў:

„Зьезд лічыць неабходным ужываньне і вывучэньне белмовы кожным комсамольцам. Комсамольская організацыя павінна стаць на чале кантролю ступені беларусізацыі савецкага дзяржаўнага апарату ўзяць ініцыятыву па вывучэньню беларускае мовы".

Кантрольны пленум таксама адзначыў, што „комсамол Беларусі ад X зьезду да 3 кантрольнага пленуму зрабіў некаторы паварот да вырашэньня важнейшых задач нацкультбудаўніцтва. Усё-ж ня гледзячы на гэта, пленум констатуе, што цэлы рад важнейшых пастаноў зьезду ЛКСМБ яшчэ ня выкананы... Пленум разглядае адсутнасьць работы па беларусізацыі як няўменьне ўзяць бальшавіцкія тэмпы у правядзеньні беларусізацыі ў той ці іншай організацыі, як няздольнасьць кіраўніцтва мобілізоўваць масы комсамолу на правядзеньне ленінскай нацполітыкі. Пленум прапануе ўсім організацыям у бліжэйшы час дабіцца пералому ў выкананьні рашэньняў зьезду па беларусізацыі".

Усё гэта павінна было прымусіць кіраўнікоў комсамольскіх колектываў задумацца над станам беларусізацыі ў іх колектывах.

Але пасьля пленуму аж да сёньнешняга дня ў справе сапраўды бальшавіцкага аўладаньня і ўжываньня белмовы не адчуваецца належнага зруху. Вопыт варашылаўцаў (організацыя брыгад па прыкладнаму вывучэньню белмовы) яшчэ не популярызаваны па ўсіх організацыях, не падхоплены, як належыць комсамолам.

У Гомельскім і Віцебскім раёнах дзе надзвычайна слаба праводзіцца беларусізацыя, не організаваны па прыкладу варашылаўцаў ўдарныя брыгады па прыкладнаму вывучэньню белмовы. Гаркомы комсамолу не мобілізавалі па-бальшавіцку комсамольцаў на лепшае ажыцьцяўленьне беларусізацыі.

Нават ў самым Менску, дзе варашылаўцы былі ініцыятарамі організацыі ўдарных брыгад па прыкладнаму вывучэньню белмовы, - беларусізацыяй ня добра. Вопыт варашылаўцаў падхоплен толькі адзінкамі. У Белкоопсаюзе, МЦРК, канторах заводаў і самых заводах уся праца праводзіцца яшчэ на расійскай мове.

У Заслаўскім раёне белмова ўжываецца таксама дрэнна. Працаўнікі ст. Беларусь, райбанку, райбольніцы працуюць выключна на расійскай мове. У месячнік праверкі ўжываньня і карыстаньня белмовай (які, да рэчы кажучы, быў правалены) працаўнік райбанку Міцькоў заявіў:

— Мне по-белорускі говорить некогда, а когда навяжут, тогда будем изучать.

Начальнік ст. Беларусь прытрымліваецца такога пункту погляду:

— „С Орши директивы поступают на русском языке, а поэтому и я буду пользоваться русским языком".

фактаў ігнараваньня дырэктыў партыі ў сэнсе хутчэйшага і лепшага ажыцьцяўленьня беларусізацыі хоць адбаўляй. Комсамол яшчэ слаба змагаецца з гэтым ігнараваньнем а ў некаторых выпадках організацыі самі ігноруюць гэтыя дырэктывы.

Кантрольны пленум ЦК ЛКСМБ рашыў: „з мэтай стварыць пералом у правядзеньні беларусізацыі пленум пастанаўляе правесьці двухмесячнік агляду стану і правядзеньня беларусізацыі ў комсамоле і савецка-дзяржаўным апараце. Мэтай гэтага агляду павінна быць поўнае ўжываньне і вывучэньне белмовы кожным комсамольцам. Няма ніводнага рабочага прадпрыемства бяз гуртка па вывучэньню белмовы, гісторыі, экономікі Беларусі".

Да двухмесячніка мы павінны прыйсьці падрыхтаванымі.

Шишка Верны.

Адказны рэдактар МІХ. ПЛАТАЎ.

Друкарня імя тав. Сталіна.

Галоўлітбел № 599